Слова для Жыцця (211)

Аўтар: Рэдакцыя
14.06.2020 00:00



Папа Францішак

Чытаючы Кнігу Быцця, бачым, як Абрагам жыў малітвай у нястомнай вернасці таму Слову, якое рэгулярна з'яўлялася на яго дарозе. Можам сказаць, што ў жыцці Абрагама вера становіцца гісторыяй.Больш таго, Абрагам сваім жыццём і прыкладам паказвае нам тую дарогу, тое пілігрымаванне, у якім вера становіцца гісторыяй… Навучымся ад Абрагама маліцца з верай, слухаць Пана, накіроўвацца за Ім, весці дыялог, а нават і дыскусію; не боймася спрачацца з Богам, нават сказаць штосьці, што магло б здавацца ерассю. Я шмат разоў чуў людзей, якія казалі мне: "Ведаеш, Ойча, у мяне здарылася штосьці такое, і я раззлаваўся на Бога. – Ты адважыўся злавацца на Бога? – Так, я раззлаваўся. – Гэта пэўная форма малітвы, таму што толькі сын можа раззлавацца на бацьку, а затым сустрэць яго зноў".

Давайце вучыцца ад Абрагама слухаць, накіроўвацца, весці дыялог і дыскутаваць, але заўсёды быць гатовымі прыняць Божае слова і ўвесці яго ў жыццё. Давайце навучымся размаўляць з Богам, як сын са сваім бацькам. Выслухоўваць Яго, адказваць, спрачацца, але празрыста – як сын з бацькам. Такой малітве вучыць нас Абрагам. Фрагмент прамовы падчас агульнай аўдыенцыі ў Ватыкане, 03.06.2020

Слова для Жыцця (211)

Аўтар: Рэдакцыя
14.06.2020 00:00

